**Список использованных источников**

1. *Арасланова, О. В.* Поурочные разработки по истории средних веков : универсальное пособие. 6 класс / О. В. Арасланова [и др.]. — 2-е изд., перераб. и доп. — М. : ВАКО, 2007.
2. *Евтухов, И. О.* Средние века в рассказах и пересказах для младших школьников / И. О. Евтухов. — Минск: УП «Экоперспектива», 2003.
3. История средних веков V—XIII вв.: учеб. пособие для 6 класса / под ред. докт. истор. наук, профессора В. А. Федосика. — Минск : Народная асвета, 2009.
4. История средних веков. 6 класс: хрестоматия / под ред. докт. истор. наук, профессора В. А. Федосика. — Минск : Народная асвета, 2009.
5. История средних веков. Атлас. — Минск : РУП «Белкартография», 2006.
6. История средних веков. Контурные карты. — Минск : РУП «Белкартография», 2007.
7. *Секацкая, К. И.* Поурочные разработки к учебнику «История Средних веков» для 6 класса общеобразовательных учреждений / К. И. Секацкая. — Минск : Аверсэв, 2009.
8. *Серов, Б. Н.* Поурочные разработки по истории России с древнейших времён до конца XIX в. : 10 класс / Б. Н. Серов [и др.]. — 2-е изд., испр. и доп. — М. : ВАКО, 2007.
9. *Федосик, В. А.* Материалы по истории древнего мира и средних веков: справочное пособие / В. А. Федосик [и др.]. — Минск: Книжный дом, Экоперспектива, 2004.
10. *Федосик, В. А.* Тесты и задания по истории древнего мира и средних веков: справочное пособие / В. А. Федосик [и др.]. — Минск: УП «Экоперспектива», 2003.
11. *Федосик, В. А.* История средних веков. V–XIII вв. 6 класс. Рабочая тетрадь / В. А. Федосик [и др.]. — Минск : Аверсэв, 2009.
12. *Федосик, В. А.* История. 6 класс: рабочая тетрадь / В. А. Федосик [и др.]. — Минск : Аверсэв, 2010.


gisdapamoga.by

# Дыдактычны сцэнарый правядзення блока ўрокаў па тэме «Культура Беларусі ў 1860-ых гадах — пачатку XX стагоддзя»

**Н. І. Дзярабіна,** настаўніца гісторыі вышэйшай катэгорыі
гімназіі № 2 г. Баранавічы

*У артыкуле прапануецца метадычная распрацоўка ўрокаў, прысвечаных вывучэнню культуры Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст., што адпавядае § 29–31 новага вучэбнага дапаможніка па гісторыі Беларусі для IX класа пад рэдакцыяй У. А. Сосны (Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2011). Аўтарам артыкула выкарыстана тэхналогія сцэнарнага мадэліравання працэсу навучання, што рэалізавана ў распрацоўцы дыдактычнага сцэнарыя, які прадугледжвае блочны метад вывучэння пытанняў развіцця культуры.*

Дадзены дыдактычны сцэнарый прапануе апісанне найбольш мэтазгодных этапаў і працэдур навучання, у т. л. формаў, метадаў, спосабаў арганізацыі і дыферэнцыяцыі вучэбнай дзейнасці дзевяцікласнікаў. Ён уяўляе сабой комплекс педагагічных сродкаў, якія ўключаюць каштоўнасна-мэтавы, змястоўна-працэсуальны, рэфлексіўна-ацэначны кам-

панenты навучання. Распрацоўка такога сцэнарыя актуальна па сваім змесце. Згодна з канцэпцыяй вучэбнага прадмета «Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі» пры дасягненні мэты ўсведамлення вучнямі самацэннасці і ўнікальнасці культур народаў свету, у т. л. беларускай культуры, значная ўвага надаецца засваенню зместу вучэбнага матэрыялу, прысвечанага пытанням развіцця культуры. Прапанаваны дыдактычны сцэнарый мае рэкамендацыйны характар і прадугледжвае варыятыўнасць пры сваёй рэалізацыі. Варта мець на ўвазе, што ў адрозненне ад плана-канспекта ўрока ў дыдактычным сцэнарыі вызначаны своеасаблівы план дзеянняў настаўніка і вучняў па засваенні зместу вучэбнага матэрыялу, раскрытага ў вучэбнай літаратуры.

**1. Каштоўнасна-мэтавы кампанент**

**1.1. Трыадзіная дыдактычная задача:** ***навучальная*** — засвоіць праз дыялогавую камунікацыю культурна-гістарычнае асяроддзе Беларусі, створанае ў 1860-ых — пачатку XX ст.; ***развіццёвая*** — развіваць навык групавога ўзаемадзеяння ў ходзе вырашэння вучэбнай задачы; ***выхаваўчая*** — выхоўваць каштоўнасныя адносіны да культурна-гістарычнай спадчыны беларускага народа.

**1. 2. Тып урокаў:** вывучэнне новага матэрыялу.

**1. 3. Матэрыяльна-тэхнічнае і дыдактычнае забеспячэнне:** вучэбны дапаможнік; атлас па гісторыі Беларусі; Корзюк А. А., Паноў С. В. Беларускія землі ў складзе Расійскай імперыі: фарміраванне індустрыяльнага грамадства і нацыі (канец XVIII — пачатак XX ст.). С. 102–108; Гісторыя Беларусі: канец XVIII ст. — 2002 г.: хрэстаматыя: 11 кл.: вучэбны дапаможнік для вучняў / аўт.-склад. Я. К. Новік [і інш.]; пад рэд. Я. К. Новіка. — Мінск : Нар. асвета, 2003. — С. 93–94.

**1. 4. Чакаемыя (плануемыя) вынікі навучання:**

*На змястоўна-дзейнасным узроўні па завяршэнні вывучэння блока.*

Вучні павінны набыць веды:

***тэарэтычныя (уменне карыстацца імі)***: даваць азначэнне беларусазнаўства (1-ы і 2-і ўзроўні) і параўноўваць яго з заходнерусізмам (4-ы ўзровень); тлумачыць прычыны з'яўлення і змест духоўнага запавету Ф. Багушэвіча беларускаму народу (3-і ўзровень); тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж палітыкай царскага ўрада ў грамадска-палітычнай галіне і закрыццём вышэйшых навучальных устаноў, а таксама ўзнікненнем цэркваў-мураўёвак у Беларусі (4-ы ўзровень); вызначаць патрыятычныя матывы ў творчасці прадстаўнікоў беларускай літаратуры (4-ы ўзровень); вызначаць ролю літаратурных твораў у фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці беларусаў (5-ы ўзровень);

***фактaлагічныя***: ведаць тыпы ўстаноў пачатковай і сярэдняй адукацыі; пералічваць прозвішчы прадстаўнікоў беларусазнаўства, беларускай літаратуры, жывапісу і іх навуковыя, творчыя дасягненні, прозвішча заснавальніка беларускага прафесійнага тэатра; прыводзіць прыклады пабудоў, узведзеных у розных архітэктурных стылях (1-ы і 2-і ўзроўні); тлумачыць, чаму настаўніцкія інстытуты ў Беларусі не давалі вышэйшай адукацыі (3-і ўзровень); параўноўваць царкоўна-прыходскія школы і народныя вучылішчы, класічныя і рэальныя гімназіі; характарызаваць гістарычныя матывы ў мастацтве Беларусі (4-ы ўзровень); ацэньваць практычную значнасць вынаходніцтваў Я. Наркевіча-Ёдкі (5-ы ўзровень);

***храналагічныя***: ведаць перыяд дзейнасці першага нацыянальнага прафесійнага тэатра пад кіраўніцтвам І. Буйніцкага (1-ы і 2-і ўзроўні);

***картаграфічныя***: лакалізаваць рэгіёны, дзе рассяліліся беларусы з апорай на картасхему ў вучэбным дапаможніку ці атласе (1-ы і 2-і ўзроўні).

*На працэсуальным узроўні.*

Вучань слухае аргументы, не ўступаючы ў дыялог (1-ы і 2-і ўзроўні); будуе выказванні на прапанаваныя тэмы, здольны выслухаць пазіцыю апанента (3-і ўзровень); фармулюе ўласную і групавую пазіцыі, усведамляе паводзіны ў прапанаванай ролі (4-ы ўзровень); займае актыўную партнёрскую пазіцыю пры падрыхтоўцы і абмеркаванні праектаў (5-ы ўзровень).



gisdapamoga.by

**2. Змястоўна-працэсуальны кампанент (арганізацыя вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў)**

**2. 1. Актуалізацыя апорных ведаў і спосабаў дзейнасці.** Для засваення тэмы патрабуецца *аднавіць веды* вучняў аб тым, якія змены і па якіх прычынах адбыліся ў сістэме адукацыі ў Беларусі ў першай палове XIX ст.; што ўяўляла сабой беларусазнаўства; якімі былі погляды прыхільнікаў заходнерусізму; каго з дзеячаў культуры лічаць першым класікам новай беларускай літаратуры; што ўяўляў сабой рамантызм у культуры Беларусі першай паловы XIX ст. і хто былі яго прадстаўнікі.

**2. 2. Фарміраванне новых ведаў і спосабаў дзейнасці** (пры прадстаўленні і засваенні зместу вучэбнага матэрыялу). Змястоўны кампанент вучэбнага блока прадугледжвае абагульненне ўяўленняў вучняў аб дасягненнях культуры беларускага народа *метадам дыялогу*. Дадзены метад накіраваны на *стварэнне камунікацыі*, якая павінна *садзейнічаць аналізу* каштоўнасна-сэнсавага кампанента вывучаемага матэрыялу. Сродкам фарміравання новых ведаў будзе з'яўляцца дыялогавая камунікацыя.

**2. 3. Першаснае замацаванне новых ведаў і ўменняў і іх далейшыя сістэматызацыя і абагульненне** (праз прымяненне на практыцы). Прадугледжваецца арганізацыя *калектыўна-размеркавальнай дзейнасці ў малых групах*, накіраваная на абмеркаванне прадстаўленага настаўнікам тэзіса і вызначэнне пры гэтым пэўнай супрацьлегласці ці на *падрыхтоўку даследаванняў па метадзе праектаў*. Варта фарміраваць *уменне комплекснага падыходу* да вырашэння вучэбнай задачы праз абагульненне атрыманых факталагічных ведаў.

***Адукацыя і навука ў 1860-ых гг. — пачатку XX ст. (§ 29).*** Вывучэнне зместу параграфа накіравана на *вырашэнне вучэбнай задачы*, звязанай з вызначэннем таго, на што былі скіраваны навуковыя даследаванні пра беларусаў і Беларусь.

Фарміраванне новых ведаў і спосабаў дзейнасці пры арганізацыі засваення зместу новага матэрыялу адбываецца праз *структураваную дыскусію*. Пачатковым момантам вырашэння вучэбнай задачы можа стаць *абмеркаванне тэзіса*: царскі ўрад пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. мабілізаваў афіцыйную навуку на пошук доказаў таго, што Беларусь спрадвеку была часткай Расіі, а беларусы ўяўлялі сабой заходнюю галіну «рускага племені». Пры гэтым увага вучняў засяроджваецца на *супастаўленні* афіцыйных установак царскага ўрада і вучоных-беларусазнаўцаў. Адсюль магчыма *выявдзенне вучнямі пэўнай супярэчнасці*, якая дазваляе *вызначыць крыніцы доказаў* існавання самастойнага беларускага этнасу. Менавіта на апошнім і трэба засяродзіць пазнавальную цікавасць вучняў.

Вучнёўскі калектыў падзяляецца на 3 групы ўдзельнікаў абмеркавання згаданага вышэй тэзіса. З ліку найбольш падрыхтаваных вучняў назначаюць 1–2 экспертаў, якія ацэньваюць правільнасць, збалансаванасць адказаў груп, а таксама 2–3 назіральнікаў, якія адзначаюць ролю ўдзельнікаў абмеркавання ў дасягненні яго вынікаў. Абмеркаванне мэтазгодна правесці ў два этапы: першы этап (унутрыструктурны дыялог) — выпрацоўка аптымальнага адказу ў групах; другі этап (міжструктурны дыялог) — выпрацоўка агульнага рашэння.

Мэтазгодна арганізаваць *самастойную працу вучняў* з тэкстам параграфа, картасхемай «Межы рассялення беларусаў. Сярэднебеларускія гаворкі», з прадмовай Я. Карскага да кнігі «Беларусы» (хрэстаматыя, с. 93–94), што дазволіць вучням вылучыць характар і асноўныя напрамкі навуковых даследаванняў, заўважыць аргументы навукоўцаў для доказу існавання самастойнага беларускага этнасу.

***Беларуская літаратура і тэатр у 1860-ых гг. — пачатку XX ст. (§ 30).*** Прадугледжваецца *вырашэнне вучэбнай задачы*, накіраванай на вызначэнне запавету, які пакінулі дзеячы беларускай літаратуры рубяжа XIX–XX стст.

Фарміраванне новых ведаў і спосабаў дзейнасці адбываецца праз такую форму арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў, як *праектная дыскусія*. Пачатковым момантам можа стаць работа вучняў над



gisdopamoga.by

праектамі згодна з інструкцыямі настаўніка, якая ажыццяўляецца напярэдадні. Фармулёўкі тэм праектаў абумоўлены межамі выканання вучэбнай задачы і характарам перапрацоўкі інфармацыі. У дадзеным выпадку мэтазгодна накіраваць пазнавальную цікавасць вучняў на вырашэнне заданняў 2, 4, 5 у § 30. Для правядзення даследаванняў можна таксама выкарыстаць дакументальныя матэрыялы ў дапаможніку Корзюка А. А., Панова С. В. на с. 103–105 (М. Гарэцкі аб жыцці і творчасці Цёткі (А. Пашкевіч); верш М. Багдановіча «Народ, беларускі народ!»). Праекты мэтазгодна рыхтаваць у малых групах.

Першаснае замацаванне новых ведаў і ўменняў і іх далейшыя сістэматызацыя і абагульненне ажыццяўляюцца праз фіксацыю вынікаў вучэбнай працы над праектамі ў форме іх прэзентацыі і адлюстроўваюць асабістую пазіцыю групы. Прадстаўленне і абмеркаванне праектаў дазваляюць вызначыць сэнсавы кампанент зместу матэрыялу для канчатковага вырашэння вучэбнай задачы.

***Жывапіс і архітэктура Беларусі ў 1860-ых гг. — пачатку ХХ ст. (§ 31).*** Вывучэнне матэрыялу арыентуецца на *вырашэнне вучэбнай задачы*, накіраванай на адлюстраванне гістарычных сюжэтаў, прыроды і гаспадаркі роднага краю ў творчасці і жыццёвым лёсе беларускіх мастакоў, а таксама ўзаемасувязі гістарычных падзей і помнікаў архітэктуры на мяжы XIX–XX стст.

Фарміраванне новых ведаў і спосабаў дзейнасці адбываецца праз такую форму арганізацыі засваення зместу параграфа, як *дыскусія з элементамі гульнявога мадэліравання*. Пачатковым момантам можа стаць *выкананне тэста-пошуку*, падчас якога вучням трэба знайсці на старонках вучэбнага дапаможніка выявы карцін К. Альхімовіча, Ю. Пэна, І. Рэпіна, М. Шагала, малюнкаў Н. Орды, помнікаў архітэктуры. Мэтазгодна *абмеркаваць ідэйны змест* мастацкіх твораў. Варта засяродзіць увагу вучняў на вызначэнні мастацкіх стыляў і жанраў твораў.

Першаснае замацаванне новых ведаў і ўменняў і іх далейшыя сістэматызацыя і абагульненне прадугледжваюць падзел класа на дзве каманды па выконваемых ролях, напрыклад «мастакі» і «архітэктары», якія задаюць адны другім па чарзе пытанні ў межах выканання вучэбнай задачы ўрока. Для аналізу пытанняў і адказаў можа быць назначана невялікая група экспертаў з ліку найбольш падрыхтаваных вучняў.

**3. Рэфлексіўна-ацэначны кампанент**

**3. 1. Метады і формы рэфлексіі.** Рэкамендуецца правядзенне *калектыўнага абмеркавання* ступені выканання вучэбных задач. Пры гэтым увага вучняў засяроджваецца на авалоданні прыёмамі вучэбнай працы, якія дазваляюць эфектыўна засвоіць змест урокаў. Сярод іх — выказванне ўласных поглядаў аб удзеле ў вырашэнні вучэбнай задачы ці ў вучэбнай працы над праектам, уменне займаць партнёрскія ўзаемаадносіны пры працы ў камандзе, усведамленне сутнасці паводзін у прапанаванай ролі (назіральніка ці эксперта, «мастака» ці «архітэктара»), фармуляванне пытанняў і аргументаваных адказаў.

**3. 2. Пастаноўка і асэнсаванне хатняга задання.** Рэкамендуецца скіраваць пазнавальную актыўнасць вучняў на пошук адказаў на наступныя пытанні і выкананне заданняў: чаму прадстаўнікі беларускай літаратуры вялікую ўвагу надавалі пытанню захавання роднай мовы; якія літаратурныя творы садзейнічалі абуджэнню нацыянальнай самасвядомасці беларусаў; даказаць, што творчасць М. Багдановіча прасякнута пачуццём патрыятызму.

Для *правядзення вучнёўскага даследавання* па выбары вучняў можна прапанаваць абагульняючае заданне на міжпрадметнай аснове: вызначыць, у чым праявілася ўнікальнасць культуры беларускага народа ў другой палове XIX — пачатку ХХ ст. і якія яе брэнды (вобразы) можна вылучыць з пазіцыі гонару за дасягненні прадстаўнікоў беларускага этнасу. Прадугледжваецца магчымасць вызначэння ў якасці брэндаў імён мастакоў і помнікаў архітэктуры.